«АГУЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ ВЕЛЬМІ ШМАТ, І МЫ АБАВЯЗКОВА БУДЗЕМ ІХ РАЗВІВАЦЬ»

Напярэдадні афіцыйнага візіту ў Кітайскую Народную Рэспубліку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 15 ліпеня даў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Сіньхуа», паведаміла прэс-служба беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь і Кітай поўныя рашучасці нарошчваць адносіны па ўсіх напрамках.

«Мы перайшлі ў сферу стратэгічнага партнёрства, стратэгічнага супрацоўніцтва паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — І хачу сказаць галоўнае: мы поўныя рашучасці — яно так і будзе — нарошчваць гэтыя адносіны, пашыраць аб'ём гэтых адносін — ад гандлю да гуманітарнага супрацоўніцтва». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта асноўная мэта яго візіту ў КНР.

«Настаў час нам з Сі Цзіньпінам абмеркаваць праблемы, якія могуць узнікнуць у сувязі з тым, што адбываецца ў свеце. Нам трэба падумаць аб далейшай стратэгіі нашага супрацоўніцтва, вырашыць шэраг тактычных праблем, якія, безумоўна, будуць уплываць на стратэгію адносін паміж Беларуссю і Кітайскай Народнай Рэспублікай», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што як у Беларусі, так і ў Кітаі могуць быць задаволены двухбаковымі адносінамі. «Гэтым самым я не хачу сказаць, што ў нас няма праблем у адносінах, няма пытанняў. Але ўсе гэтыя праблемы і пытанні паспяхова вырашаюцца. Для гэтага і існуюць розныя, або рознага ўзроўню, кантакты паміж дзяржавамі», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што ўзровень адносін паміж Беларуссю і Кітаем вельмі высокі. «У беларуска-кітайскіх адносінах увогуле няма закрытых тэм. Мы супрацоўнічаем на асновах узаемаразумення і самай глыбокай дружбы, я нават сказаў бы, прыхільнасці нашых краін і нашых народаў адзін да аднаго», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў бакоў няма праблем ні ў сферы эканомікі, ні ў палітыцы. «Мы некалі марылі аб тым, каб дасягнуць тавараабароту $500 млн паміж дзвюма дзяржавамі. Сёння мы ўжо круцімся каля лічбы $3 млрд. Гэта вельмі вялікі прагрэс», — канстатаваў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Беларусь заўсёды падтрымлівае ініцыятывы КНР у міжнародных арганізацыях, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Тым жа плаціць нам і Кітайская Народная Рэспубліка. Не было той праблемы, таго пытання, калі Кітай, Вялікі Кітай, не падтрымаў бы Беларусь: няхай гэта будуць праславутыя правы чалавека, у парушэнні якіх абвінавачваюць і нас, і Кітайскую Народную Рэспубліку. Праўда, цяпер усе замаўчалі, калі былі абнародаваны факты аб тым, як паводзіць сябе Захад па правах чалавека. Але былі часы, калі накаты ішлі і на Беларусь, і на Кітай. Тады мы былі разам», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што краіны цесна супрацоўнічаюць у касмічнай, ваенна-тэхнічнай, гуманітарнай сферах. «У нас няма ніякіх вялікіх праблем ні па адным з кірункаў. Гэта сведчыць аб тым, што мы перайшлі ў сферу стратэгічнага партнёрства, стратэгічнага супрацоўніцтва паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь», — канстатаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь мае намер паглыбляць супрацоўніцтва з Кітаем у сферы высокіх тэхналогій.

«Нам ад Савецкага Саюза, на шчасце і няшчасце, дасталася тая эканоміка, аб якой вы ведаеце, тая навука і іншае. На няшчасце — таму што гэта не можа быць запатрабавана ўсё ў Беларусі. А на шчасце — таму што гэта вельмі высокага ўзроўню вытворчасці, тэхналогіі, навукова-тэхнічная галіна. І нам трэба, каб не панізіць, каб не зменшыць гэтыя кірункі развіцця Беларусі, абавязкова супрацоўнічаць з магутнымі дзяржавамі, якія маюць патрэбу ў новых тэхналогіях, у новых распрацоўках, у той прадукцыі, якую мы вырабляем», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён адзначыў, што Беларусь — экспартаарыентаваная дзяржава. «Таму, на шчасце, мы знайшлі такія краіны, як Расія, як Вялікі Кітай, у нас з Індыяй вельмі добрыя адносіны. Вось у гэтым напрамку мы будзем дзейнічаць, пашыраючы, паглыбляючы наша супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — дадаў беларускі лідар. «Усё павінна быць заснавана на высокіх тэхналогіях. Мы павінны думаць аб заўтрашнім дні», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, у Беларусі і Кітая існуе вельмі вялікі патэнцыял для далейшага развіцця адносін. «Вельмі шмат кірункаў нашага супрацоўніцтва: ад эканомікі, крэдытаў, інвестыцый... А сёння Кітай рэалізуе ў нас 20 праектаў прыкладна на $5,5 млрд. Інвестыцыі вельмі вялікія. Яны супастаўныя, можа быць, толькі з Расійскай Федэрацыяй, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Таму агульных інтарэсаў вельмі шмат, і мы абавязкова будзем іх развіваць».

Падчас інтэрв'ю размова ішла таксама аб стварэнні Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок вельмі разлічвае на гэты кітайска-беларускі праект. «Вядома ж, вядучую ролю тут адыграе Кітайская Народная Рэспубліка. Гэта інвестыцыі вядучых кампаній свету, якія сёння працуюць у Кітаі. Гэта крэдыты Кітайскай Народнай Рэспублікі. Добра, што валютных рэзерваў у Кітаі дастаткова. Іх трэба, вядома ж, некуды інвеставаць. І паверце, гэта прызнанне надзейнасці Беларусі ў вачах кітайскага кіраўніцтва, кітайскіх спецыялістаў, кітайскага народа. Вы ў нестабільную краіну свае грошы ўкладваць не будзеце. Таму мы высока ацэньваем гэты праект», — сказаў беларускі лідар.

«З моманту рэалізацыі гэтага праекта ў поўным аб'ёме краіна ў год будзе атрымліваць дадаткова да $50 млрд экспарту. Гэта павялічыць нашу фінансавую стабільнасць. Сёння гэта самае вострае пытанне для нашай краіны. Гэты праект здымае гэту праблему», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Самае галоўнае, мы не ствараем тут «парк адвёртак», вобразна кажучы. Тут павінен выпускацца высокатэхналагічны прадукт заўтрашняга дня: ад распрацовак да вытворчасці, у канчатковым выніку, канкрэтнага тавару, які пойдзе на рынак», — сказаў Прэзідэнт.

«Па-першае, нам у эканоміцы зборка не патрэбна. У нас няма свабодных рабочых месцаў, свабодных рабочых рук, якія трэба было б тэрмінова заўтра задзейнічаць. Гэта як некалі было ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы, калі яны стваралі зоны свабоднага гандлю. Нам патрэбны высокатэхналагічны прадукт. Таму што ў нас высокатэхналагічная рабочая сіла», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«А па-другое, калі мы не выпусцім у гэтым парку прадукцыю заўтрашняга дня, мы яе не прададзім тут. Яе ўжо ніхто не купіць. Таму парк арыентаваны на прыцягненне сусветных кампаній з высокатэхналагічным прадуктам, з прадуктам ужо заўтрашняга эканамічнага ўкладу, каб мы маглі на гэтым высокатэхналагічным рынку гандляваць гэтым прадуктам, каб ён знаходзіў збыт і быў канкурэнтаздольным. Гэта галоўнае. Мы на гэта разлічваем», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з кітайскім бокам вырашаны ўсе арганізацыйныя пытанні і цяпер бакі пачынаюць будаўніцтва канкрэтных фабрык, заводаў, прадпрыемстваў, навукова-тэхнічных, канструктарскіх цэнтраў па распрацоўцы і вытворчасці высокатэхналагічнага тавару.

«Калі Кітайская Народная Рэспубліка пазіцыянуе сябе сёння ўжо як імперыя, у добрым сэнсе слова, калі гэта вядучая дзяржава — без Еўропы, без гэтага цэнтра яна развівацца не можа. Я лічу, што Кітайская Народная Рэспубліка выбрала Беларусь. Гэта таксама аб многім сведчыць. І мы ганарымся гэтым. Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Тут выдатная лагістыка на высокатэхналагічныя і аплатныя рынкі», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, Беларусь многаму вучылася ў Кітая і ў сваю чаргу гатова многае прапанаваць КНР. «Мы шмат запазычылі ў Кітайскай Народнай Рэспублікі, развіваючы рыначныя адносіны ў нашай краіне, з нашай спецыфікай, беларускай, — сказаў Прэзідэнт. — Мы вучыліся ў вас развіццю свабодных эканамічных зон і іншаму. Вось у гэтым мы гатовы развіваць нашы адносіны. Але, галоўнае, калі гаварыць аб эканоміцы, — высокія тэхналогіі».

«Кітай — гэта краіна, якая рухаецца вельмі маштабна, вельмі інтэнсіўна развівае сваю эканоміку, і мы на парозе таго, што адбываецца перафарматызацыя ўсіх адносін і пераўладкаванне ўсяго міжнароднага клімату на нашай планеце. І віной таму — Кітайская Народная Рэспубліка. Гэта вядучая дзяржава свету, і сёння, вы ведаеце, калі трэба «змераць тэмпературу» на планеце, то гэта ўжо не ў Вашынгтоне, не ў Бруселі... Гэта ўжо ў Пекіне», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь ганарыцца адносінамі з Кітаем, звярнуўшы ўвагу на тое, што яны сталі развівацца не ўчора. «Мы маем вельмі працяглыя адносіны. Мы з вамі былі і 20 гадоў таму. Я помню свае першыя візіты ў Кітайскую Народную Рэспубліку (зусім нядаўна быццам бы было), калі Кітай і кіраўніцтва Кітая проста марылі аб тым, каб выцягнуць краіну на вядучыя пазіцыі ў свеце. Гэта было ўсё на маіх вачах. І тады ўжо нашы адносіны завязваліся. Тады мы пачыналі ўжо супрацоўнічаць з Кітаем. Я заўсёды гаварыў, што за Кітаем будучыня. Але я ніколі не мог уявіць і падумаць, што гэта адбудзецца літаральна за паўтара-два дзясяткі гадоў», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Беларусь даўно цікавіцца вопытам Кітая, а па многіх напрамках паклала яго ў аснову развіцця дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў беларускім урадзе працуе нямала вопытных людзей, якія добра ведаюць Кітай. «Я пра сябе ўжо не кажу, я толькі шэсць разоў быў у Кітаі. Не кажучы ўжо аб візітах у Кітайскую Народную Рэспубліку спецыялістаў. Мы вучымся адзін у аднаго, ідзе інтэнсіўны абмен, і, зразумела, да гэтых працэсаў мае дачыненне цэлы пласт людзей, якія сёння ўдзельнічаюць у кіраванні нашай краінай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы ўзялі курс на амаладжэнне нашых кадраў. Дарэчы, тут таксама можна выкарыстаць вопыт Кітайскай Народнай Рэспублікі. Вы яго прытрымліваецеся ўжо тры пяцігодкі, прыцягваеце маладыя кадры, асабліва ў сярэднім, нізкім звёнах кіравання. Гэта таксама адпавядае тым падыходам, якія прапаведуюцца ў кіраванні нашай дзяржавай», — адзначыў Прэзідэнт.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПРЭЗІДЭНТУ ІЗРАІЛЯ ШЫМОНУ ПЕРЭСУ ЎРУЧЫЛІ БЕЛАРУСКАЕ ПАСВЕДЧАННЕ АБ НАРАДЖЭННІ

Прэзідэнту Дзяржавы Ізраіль Шымону Перэсу ўчора было ўрачыста ўручана памятнае пасведчанне аб нараджэнні, якое пацвярджае факт яго з'яўлення на свет 2 жніўня 1923 года на беларускай зямлі ў вёсцы Вішнева, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі.

Памятнае пасведчанне аб нараджэнні было ўручана Шымону Перэсу ў рэзідэнцыі кіраўніка ізраільскай дзяржавы начальнікам упраўлення Афрыкі і Блізкага Усходу МЗС Беларусі Ігарам Ляшчэнем, які раней на працягу шасці гадоў узначальваў беларускае дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Ізраілі, пры ўдзеле ганаровага консула Беларусі ў Дзяржаве Ізраіль Анатоля Моткіна.

Падчас сустрэчы з Шымонам Перэсам Ігар Ляшчэня падкрэсліў, што прэзідэнта Ізраіля заўсёды рады бачыць на яго малой радзіме.

Шымон Перэс з'яўляецца адным з самых вядомых палітыкаў сучаснасці. Выдача яму памятнага пасведчання аб нараджэнні стала адным з мерапрыемстваў, арганізаваных у Беларусі ў сувязі з маючым адбыцца 90-годдзем знакамітага земляка. У прыватнасці, 29 мая ў Вішнева ў прысутнасці дачкі кіраўніка ізраільскай дзяржавы Цвіі Вальдэн была адкрыта памятная дошка на доме, у якім нарадзіўся і вырас прэзідэнт Ізраіля. У той жа дзень у Вішнева адбылося адкрыццё спецыяльнай фотавыставы «Шымон Перэс: шлях ад Віленскай вуліцы ў Вішнева на Прэзідэнцкую вуліцу ў Іерусаліме».

СТАЦЫЯНАРНЫЯ КАМЕРЫ НА МКАД ФІКСУЮЦЬ...

За 5 дзён работы стацыянарныя камеры на МКАД зафіксавалі амаль 3 тыс. парушэнняў ПДР.

Стацыянарныя камеры фотафіксацыі парушэнняў ПДР за апошнія пяць дзён зарэгістравалі на Мінскай кальцавой дарозе 2869 фактаў перавышэння ўстаноўленай хуткасці руху транспартных сродкаў. Як паведаміла кіраўнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Таццяна Харлінская, перавышэнне ад 12 да 20 км/г дапусцілі 2367 кіроўцаў, ад 21 да 30 км/г — 404, звыш 30 км/г — 98.

Усе парушальнікі правілаў атрымаюць так званыя «пісьмы шчасця» і вымушаны будуць заплаціць штраф.

Нагадаем, 7 комплексаў фотафіксацыі хуткасці з 10 ліпеня фіксуюць парушэнні хуткаснага рэжыму на пяці найбольш аварыйна небяспечных участках МКАД. Гэта нулявы км (у раёне перасячэння з праспектам Незалежнасці), 2-гі км (з вуліцай Скарыны), 10-ы (з вуліцай Машынабудаўнікоў), 24-ы (з праспектам Дзяржынскага) і 39-ы (з вуліцай Ціміразева).

«Мінск-Навіны».

У ПУНКЦЕ ПРОПУСКУ «НОВАЯ ГУТА» СІТУАЦЫЯ НАРМАЛІЗАВАЛАСЯ

У пункце пропуску «Новая Гута», дзе на працягу апошніх трох дзён назіраліся вялікія аўтамабільныя чэргі, нармалізавалася сітуацыя да раніцы 16 ліпеня. Цяпер пункт працуе ў звычайным рэжыме, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Гомельскай пагранічнай групы.

Зараз на подступах да пункта пропуску «Новая Гута» няма вялікай колькасці аўтамабільнага транспарту, як было ў выхадныя дні і 15 ліпеня. Такая ж сітуацыя і па іншых пагранпераходах беларуска-ўкраінскага кірунку. Невялікая чарга з 30 аўтамабіляў назіраецца толькі ў «Камарыне».

Аднак да наступных выхадных спецыялісты зноў прагназуюць рост транспартнага патоку, што звязана з пачаткам масавага сезона адпачынкаў. Для таго, каб правільна выбраць маршрут руху і пазбегнуць чэргаў, пагранічнікі рэкамендуюць перад выездам знаёміцца з абстаноўкай у пунктах пропуску, выкарыстоўваючы сайт Дзяржаўнага пагранічнага камітэта.

У прэс-службе нагадалі, што, акрамя пунктаў пропуску «Новая Гута», вадзіцелі таксама могуць скарыстацца «Весялоўкай» і «Камарынам». Для грамадзян Беларусі, акрамя гэтага, адкрыты «Новая Рудня», «Аляксандраўка» і «Глушкавічы». Жыхары Гомеля і Гомельскага раёна таксама могуць перасячы дзяржмяжу праз спрошчаныя пункты пропуску «Паддабранка», «Глыбоцкае», «Андрэеўка».

НА БУДОЎЛІ ПЕРАКУЛІЛАСЯ БЕТОНАМЯШАЛКА

Здарэнне адбылося ўвечары ў сталіцы на тэрыторыі будоўлі шматфункцыянальнага комплексу па праспекце Пераможцаў: пры пад'ездзе да месца разгрузкі бетону аўтабетоназмяшальнік «КамАЗ» перакуліўся. Пры гэтым заціснула кіроўцу 1987 года нараджэння. Работнікі МНС дасталі пацярпелага з-пад транспартнага сродку. Прыбыўшая брыгада хуткай медыцынскай дапамогі мусіла канстатаваць смерць мужчыны. Прычына здарэння высвятляецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«АЎДЗІ» — НЕ «СІТРАЕН»

Рух легкавога аўтамабіля «Аўдзі А6», якім кіраваў грамадзянін Беларусі, спынілі падчас спецыяльнага мерапрыемства супрацоўнікі аператыўна-пошукавага аддзела Гомельскай мытні сумесна з ДАІ.

Паводле рэгістрацыйных нумароў аўтамабіль стаяў на ўліку ў Мінску, аднак праверка па базе даных паказала, што нумары належаць зусім іншаму аўто — «Citroen Xsara Picasso». Пры вывучэнні пасведчання пра рэгістрацыю транспартнага сродку былі выяўлены відавочныя сляды падробкі. Кіроўца патлумачыў, што набыў машыну ў Санкт-Пецярбургу — разам з рэгістрацыйным нумарам Рэспублікі Беларусь. Таксама пры продажы грамадзяніну выдалі пасведчанне пра рэгістрацыю. Падчас праверкі было высветлена, што ў базе даных Дзяржаўнага мытнага камітэта звестак пра здзяйсненне мытных аперацый на тэрыторыі нашай краіны з гэтым аўтамабілем няма. У сувязі з тым, што невядомая асоба не задэкларавала аўтамабіль пры ўвозе на тэрыторыю Беларусі, а потым перадала яго ў парушэнне парадку, аўтамабіль «Аўдзі А6» коштам больш за Br111 млн рублёў канфіскаваны. Пачаты адміністрацыйны працэс, паведамілі ў прэс-групе Гомельскай мытні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДЗЕ ШУКАЦЬ БУДУЧЫХ ЧЭМПІЁНАЎ?

Каб дабіцца значных спартыўных дасягненняў, прафесійныя трэніроўкі трэба пачынаць з дзяцінства. Не выключэнне з гэтага правіла і тэніс. Ужо пяты год запар у Беларусі праходзіць адборачны этап міжнароднага турніру NIKE JUNIOR TOUR. На ім вызначаюцца найлепшыя юныя тэнісісты краіны, чацвёра з якіх паляцяць на міжнародны фінал у снежні ў амерыканскай Фларыдзе. Рэгіянальны турнір у Мінску стартаваў учора на кортах спартыўнага цэнтра Максіма Мірнага.

З сям'ёй.

Гэты турнір праходзіць у шмат якіх краінах свету. У свой час перамог на ім дабіліся будучыя зоркі сусветнага тэніса Рафаэль Надаль, Марыя Шарапава... Праўда, юныя беларусы не праходзілі далей за чацвёрты круг. Але хто ведае, можа, сёлета сітуацыя кардынальна пераменіцца?— Аднак я хачу звярнуцца да бацькоў: аддавайце дзяцей у тэніс без усякага прымусу, — заклікаў алімпійскі чэмпіён, заслужаны майстар спорту Беларусі Максім Мірны. — Усё-такі гэтае задавальненне да разраду танных не адносіцца. Увогуле, практыка паказвае, што чэмпіёны пераважна нараджаюцца ў аддаленых гарадах, пасёлках, вёсках... І таму мы імкнёмся праводзіць турнір у два этапы: некалькі рэгіянальных і адзін агульнарэспубліканскі. Мы гэта робім з агляднай на тое, што ўзровень сусветнага тэнісу расце вельмі імкліва, канкурэнцыя ў ім зараз проста дзікая. Таму трэба вучыць юных спартсменаў і... майстэрству годна прайграваць. І рабіць гэта як мага раней. Пазней сыходзіць з корта ні з чым будзе куды цяжэй у псіхалагічным сэнсе.

На фінал міжнародных спаборніцтваў паедуць толькі два лепшыя хлопчыкі і дзве дзяўчынкі. Сёлета Максім Мірны адкрыў рэгіянальныя этапы ў Віцебску, Гродне і Пінску падчас здымак першага беларускага рэаліці-шоу, у якім удзельнічае разам са сваёй вялікай сям'ёй.

— Яшчэ перад пачаткам здымак у мяне з'явілася жаданне паказаць, што ў пошуку цікавых і прыгожых месцаў для адпачынку не заўжды варта ехаць кудысьці за мяжу. І цяпер магу сказаць, што іх у Беларусі вельмі шмат. Проста, мабыць, самі людзі не заўжды ўсведамляюць, якое культурнае і гістарычнае мінулае маюць нашы невялічкія гарады... Я сам з-за сваёй пастаяннай прафесійнай занятасці толькі зараз наведаў легендарныя Браслаўскія

азёры, — адкрыта працягвае Максім Мірны. — Усяго за тыдзень мы накруцілі па Беларусі больш за дзве тысячы кіламетраў! І гэта прытым, што абмінулі Магілёўшчыну і Гомельшчыну. Чаго мы толькі не рабілі — і параходам на Прыпяці кіравалі, і на мячах біліся ў Лідскім замку, і з парашутам скакалі. Вядома, хацелася б гэтае задавальненне расцягнуць хаця б на месяц. Але падціскае час, яго заўжды не хапае...

Шоу пакуль што носіць працоўную назву «Мірны тур па Беларусі». Зусім хутка яно выйдзе на шырокі экран. Гледачы тэлеканала «Беларусь-2» і спадарожнікавага «Беларусь 24» змогуць убачыць прэм'еру ўжо ўвосень.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Надзеі БУЖАН.

■ Каб памяталі

На Кургане Дружбы ля рэчкі Няверыца

Па добрай традыцыі на сёлетняй — 54-ай па ліку — міжнароднай сустрэчы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху Расіі, Беларусі і Латвіі, што адбываецца на мяжы трох краін, правілі баль сяброўства і павага да памяці тых, каму мы ўдзячныя за перамогу. Насамрэч не верыцца, што калісьці адзіную краіну цяпер падзяляе мяжа. Сам Курган застаўся на латвійскім баку.

«ЦЁРКІН» АТРЫМАЎ МЕДАЛЬ

Для аднаго з ветэранаў гэтая сустрэча стала ўдвая прыемнай. Іван Пятровіч Іваноў праз дзясяткі гадоў пасля заканчэння вайны атрымаў медаль партызана Айчыннай вайны 1 ступені. У свае гады ён поўны энергіі. А як выразна і ліха прачытаў са сцэны верш пра вайну — некаторым прафесійным артыстам ёсць чаму ў яго павучыцца! Мне ветэран чамусьці адразу нагадаў літаратурнага героя Цёркіна. Такі ж: з гумарам, з маладымі вачыма, у якіх шмат энергіі і дабрыні. Высветлілася, што ён ваяваў з Пятром Міронавічам Машэравым.

— Не верыцца, што мне ўжо 87 гадоў? У чым мой сакрэт маладосці? І сам не ведаю, чаго такі жыўчык (*шчыра смяецца.* — **Аўт.**). Моцна гарэлку не піў, так, выпіваў патроху, не куру. Жыву ў Себежскім раёне, — расказвае Іван Пятровіч. — Два дамы пасля вайны пабудаваў, а наогул газавіком быў. У мяне чацвёра дзяцей, праўнукаў трое, а ўнукаў... ужо і забыўся, колькі (*смяецца*). Беларусаў я люблю. З вашым Машэравым партызаніў.

Салдацкая хустка.

Паважаны ветэран расказаў, што вясной 1943 года добраахвотна запісаўся ў партызаны і стаў байцом партызанскай брыгады. Камандаваў аддзяленнем разведкі. Ваяваў на тэрыторыі трох раёнаў. Пасля вызвалення Себежскага раёна быў прызваны на службу. Ваяваў у складзе 41-й танкавай Чырвонасцяжнай ордэна Аляксандра Неўскага брыгады. Быў зараджальнікам у легендарным танку «Т-34». У 1944-м камісаваны з-за цяжкага ранення. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, двума медалямі «За адвагу», медалём «За перамогу над Германіяй».

І АСВЕЙСКАЯ ТРАГЕДЫЯ НЕ ЗАБЫТАЯ

Падчас сустрэчы на Кургане Дружбы пагаварыў з прадстаўніком улады Верхнядзвінскага раёна.

— Сёння ў нас праводзіцца традыцыйная сустрэча на Кургане Дружбы партызанаў вайны і падпольшчыкаў. Сёлета прымаючым бокам з'яўляецца Расія, летась былі мы. І так па чарзе святкаванне праводзім. Ужо зараз рыхтуемся да наступнага года, калі пройдзе 55-я, юбілейная, сустрэча. З беларускага боку непадалёку ад Кургана знаходзіцца музей баявой славы, які сёння працуе, а так зачынены, таму што знаходзіцца ў памежнай зоне. Адкрываецца гэты ўнікальны музей толькі ў дні правядзення мерапрыемстваў, — расказала Таццяна Севалкіна, намеснік старшыні Верхнядзвінскага райвыканкама.

А нядаўна ў раённым цэнтры дзяцей і моладзі адбылася прэзентацыя другога выдання кнігі «Асвейская трагедыя», якую напісаў Сяргей Панізнік. Кніга пабачыла свет дзякуючы выдавецкаму дому «Звязда».

— Тры гады таму мы звярнуліся да тэмы спаленых вёсак. Першай ластаўкай стала кніга «Нашчадкі вогненных вёсак», якая пасля прэзентацыі хутка разышлася, — расказвала Ала Корбут, намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда». — Мы пастараліся, каб нават вокладка кнігі «Асвейская трагедыя» была сімвалічнай, сама па сабе несла «код» памяці, каб кожны з нас памятаў пра гэтую трагедыю, расказваў аб ёй дзецям і ўнукам.

У перавыданні кнігі браў удзел і мясцовы краязнаўца Антон Францавіч Бубала, жыхар адной са спаленых вёсак. Падчас прэзентацыі кнігі ён адзначыў, што такую літаратуру нельга разглядаць з пункту гледжання мовы, вобразаў і кампазіцыі, бо найвышэйшая яе каштоўнасць — праўда...

Ветэран Іваноў.

Курган Дружбы, дарэчы, не толькі сімвал памяці, гонару, гэта — сімвал веры, перспектывы і развіцця.

Жыхар Латвіі Анатоль Трашкоў і жыхарка Верхнядзвінскага раёна Уладзіслава Сава пазнаёміліся летась ля Кургана Дружбы.

— Можна сказаць тут знайшлі адзін аднаго. І потым падтрымлівалі стасункі па інтэрнэце. Вырашылі сустрэцца. Месца гэтае спрыяе стасункам, — расказаў Анатоль. Цікава, што ён мае грамадзянства Латвіі, бо там нарадзіўся яго бацька. Я — член грамадскай арганізацыі ветэранаў вайны, якая займаецца даследаваннем барацьбы з фашызмам краін антыгітлераўскай кааліцыі. Кожны год прыязджаю сюды. Прыемна бачыць тут усё больш моладзі. Не трэба забываць традыцыі, таму ў сваю арганізацыю мы вельмі ахвотна прымаем маладых.

У рамках святочных мерапрыемстваў на Кургане Дружбы адбылася сустрэча прадстаўнікоў афіцыйных дэлегацый Расіі, Беларусі і Латвіі, потым прайшлі ўрачысты мітынг і цырымонія ўскладання кветак да помнікаў Марыі Пынто, Іманта Судмаліса, членаў падпольнай камсамольскай арганізацыі вёскі Прошкі. Вельмі цікавым атрымаўся святочны канцэрт. Мерапрыемства працягнулі «Вогнішча Дружбы» і «Агеньчык для ветэранаў».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.
Верхнядзвінскі раён.

Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні фотакарэспандэнту газеты «Звязда» Марыне Бегунковай ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю свекрыві, вядомага беларускага журналіста ЛЮДМІЛЫ ЛЕАНІДАЎНЫ СІДАРОВІЧ.